УДК 821.161.3

# ГЕНЕЗІС І ЖАНРАВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКАГА ДЗІЦЯЧАГА МАСТАЦКАГА АПАВЯДАННЯ

**Лебедзеў Аляксандр Уладзіміравіч**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 28 г. Магілёва»;
магістр філалагічных навук

*У артыкуле разглядаецца апавяданне як жанр беларускай дзіцячай мастацкай літаратуры. Вызначаецца генезіс «малой эпічнай формы», яе жанравыя асаблівасці. Выяўляюцца прычыны запатрабаванасці апавядання як жанру ў нацыянальным прыгожым пісьменстве для дзяцей.*

Перш, чым ахарактарызаваць апавяданне як жанр беларускай дзіцячай мастацкай літаратуры, звернемся на падставе тэарэтычных крыніц да вызначэння сутнасці паняцця «дзіцячая літаратура», разуменне сэнсу якога паспрыяе карэктнай гутарцы пра жанравую адметнасць «малой эпічнай формы» (такі сінанімічны адпаведнік паняццю «апавяданне» прыводзіць М. Лазарук [3]), адрасаванай дзецям.

Згодна з вызначэннем Аляксандра Макарэвіча, «дзіцячая літаратура – галіна літаратурнай творчасці і яе вынікі, скіраваныя на дзіцячую <…> аўдыторыю <…>» [5, с. 49]. Гэтая сфера нацыянальнага прыгожага пісьменства садзейнічае фарміраванню пэўнай пазіцыі чытача да жыцця, эмацыйна-каштоўнасных адносін да праяў рэчаіснасці, living рознабаковаму развіццю асобы. Выхоўваць чалавека малога гадамі дапамагаюць літаратурныя жанры, у тым ліку, як адзначае літаратуразнаўца, апавяданні [5, с. 49].

Паводле вывадаў А. Макарэвіча, апавяданне адносіцца да асноўных жанраў беларускай дзіцячай мастацкай літаратуры [4, с. 58], што сведчыць пра яго запатрабаванасць. Папулярнасць «малой эпічнай формы» можна абумовіць многімі фактарамі: яе генезісам, жанравымі асаблівасцямі, узроставымі і індывідуальнымі адметнасцямі рэцыпіента.

Апавяданне (што са сферы дзіцячага чытання, што з кола т. зв. «дарослага» чытання) узыходзіць да жанраў вуснай народна-паэтычнай творчасці. Менавіта так характарызуюць яго паходжанне А. Адамовіч [1], С. Андраюк [2], М. Лазарук [3], В. Рагойша [6]. Вытокі гэтага жанра – у анекдоце, гумарэсцы, казцы, паданні.

Аўтар і назва першага беларускага дзіцячага апавядання дакладна невядомыя. Для параўнання: некаторыя айчынныя літаратуразнаўцы мяркуюць, што пачынальнікам беларускага празаічнага апавядання (без вызначэння адрасата, але, відаць, прызначанага для дарослых) з'яўляецца Адам Плуг. Яго твор «Кручаная баба» (1849) С. Андраюк [2] лічыць "першапраходцам" у гэтым жанры. Пісьменнік завяршыў як мінімум чатыры апавяданні на беларускай мове, аднак да нашага часу дайшоў толькі згаданы вышэй твор.

Іншыя літаратуразнаўцы стварэнне першага беларускага празаічнага апавядання прыпісваюць Францішаку Багушэвічу, а ў якасці такога твора М. Лазарук [3] і В. Рагойша [6] называюць «Тралялёначку». Апавяданне выйшла асобнай кнігай без указання імя аўтара ў 1892 г. у Кракаве (Польшча). Сярод яго персанажаў заўважаем вобраз дзяўчынкі. Калі ўлічваць той факт, што ў сферу дзіцячага чытання ўваходзяць, прынамсі, творы, якія першапачаткова ствараліся для дарослых, але з цягам часу адрасаваліся таксама дзецям (як мінімум па прычыне наяўнасці ў творы даступнага для іх успрымання вобраза дзіцяці), то можна дапусціць, што «Тралялёначка» – першае беларускае дзіцячае апавяданне.

Доказ таму, што беларускае дзіцячае апавяданне ў значнай ступені паходзіць з фальклору, знаходзім у творах гэтага жанру, напрыклад, Цёткі (апавяданні «Гутарка асота з крапівою», «З прыску ды ў агонь», «Пакуль не ў руках, не кажы, што тваё», «Сварба») і інш.

Традыцыі вуснай народна-паэтычнай творчасці істотна паўплывалі на замацаванне апавядання ў якасці аднаго з актыўных жанраў беларускай дзіцячай мастацкай літаратуры. Запатрабаванасць «малой эпічнай формы» ў гэтым чытацкім асяроддзі яшчэ тлумачыцца яе жанравымі перавагамі.

Як правіла, апавяданню як жанру характэрны наступныя ўласцівасці:

1) празаічная мова;
2) невялікі аб'ём;
3) наяўнасць аднаго або некалькіх персанажаў;
4) адлюстраванне адной вызначальнай жыццёвай падзеі;
5) аднлінейнасць сюжэта;
6) адносная сфарміраванасць характару героя або дзейных асоб;
7) простая кампазіцыя.

Падсумуем пералічаныя прыметы слушным вывадам М. Лазарука: «Сцісласць і лаканічнасць формы ў апавяданні спалучаюцца з асаблівай насычанасцю зместам, стройнасцю будовы, выразнасцю моўна-выяўленчых сродкаў, што дазваляе апавяданню раскрываць вельмі значныя з'явы жыцця, складаныя чалавечыя характары» [3, с. 25].

Адносна выдзеленых характарыстык зробім некалькі заўваг.

Па-першае, вышэй адзначаны, скажам так, класічныя асаблівасці апавядання як жанру. Паколькі беларуская дзіцячая мастацкая літаратура няспынна развівалася, то і апавяданне з цягам часу займела нямала мадыфікацый з адпаведнымі для іх жанравымі адметнасцямі. Да прыкладу: аб'ём можа вымярацца некалькімі главамі (апавяданне «Сябры» А. Васілевіч), вялікай можа быць колькасць дзейных асоб (апавяданне «Кот Знайдзён» Л. Чарняўскай), адлюстраванымі могуць быць два і больш жыццёвыя эпізоды (апавяданне «Слёзы Тубі» Я. Маўра), сюжэт можа складацца з дзвюх і болей ліній (апавяданне «Чарнавочка» А. Якімовіча).

Па-другое, згаданыя вышэй асаблівасці ў аднолькавай ступені ўласцівы апавяданням, прызначаным і для чытання

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

дарослымі, і для чытання дзецьмі. Аднак дзіцячая мастацкая літаратура – асобная галіна беларускага слоўнага мастацтва, і развіваецца яна па сваіх законах. З гэтай прычыны падкрэслім: дзіцячае апавяданне не тоеснае даросла    му апавяданню. Нягледзячы на шэраг агульных жанравых прымет, «малая эпічная форма» для дзяцей існуе і развіваецца згодна са спецыфікай свайго адрасата.

Беларускае дзіцячае мастацкае апавяданне прызначана, відавочна, для дзяцей. Пісьменнік, які працуе ў рэчышчы «малой эпічнай формы», безумоўна, улічвае ўзроставыя і індывідуальныя асаблівасці рэцыпіента. Апавяданне са сферы дзіцячага чытання – яскравае сведчанне арыентацыі аўтараў на пэўны ўзрост дзіцяці (дашкольны, малодшы школьны, сярэдні школьны (падлеткавы), старшы школьны) і на індывідуальнасць дзіцяці (яго характар, памкненні, інтарэсы).

Якраз узроставыя і індывідуальныя адметнасці дзіцяці як адрасата мастацкага твора абумоўліваюць спецыфічныя жанравыя асаблівасці дзіцячага апавядання. Выдзелім і пракаменціруем некаторыя з іх.

1. *Дзіця – галоўны герой твора*. Выкарыстанне дзіцяці ў якасці цэнтральнага персанажа небеспадстаўнае. З аднаго боку, такая дзейная асоба для маленькага чытача набліжае мастацкі свет твора да рэальнага жыцця. Рэцыпіент адмыслова параўноўвае сябе з літаратурным героем. З іншага боку – дзякуючы вобразу дзіцяці чытач імкнецца да пераймальніцтва ў паводзінах, характары.

2. *Адналінейнасць або разгалінаванасць сюжэта*. Выбар аднаго з двух варыянтаў сістэмы падзей у мастацкім творы дыктуецца найперш узростам рэцыпіентаў. Чытачам дашкольнага і малодшага школьнага ўзростаў прапаноўваецца адналінейны сюжэт, паколькі яны яшчэ не могуць засяроджвацца на ўспрыманні і асэнсаванні шырокага ланцуга падзей твора. Для чытачоў жа сярэдняга школьнага і старшага школьнага ўзростаў ствараецца разгалінаваны сюжэт з некалькімі падзейнымі лініямі. Адналінейны сюжэт знаходзім у апавяданні «Пяць лыжак заціркі» З. Бядулі, а разгалінаваны сюжэт – у апавяданні «Колька» М. Багдановіча.

3. *Дынамічнасць сюжэта*. Звычайна дзеці ўражлівыя, чуйныя, эмацыйна рэагіруюць на пачутае і ўбачанае. Адсюль – разгортванне падзей у мастацкім творы такім чынам, каб стварыць для рэцыпіента сітуацыю захаплення. Таму сюжэт «малой эпічнай формы» складаецца з той колькасці падзей, якіх дастаткова, каб захапіць маленькага чытача незвычайнасцю, прыгодамі, напружанасцю. Дынамічны сюжэт сустракаем у апавяданні «Янка-парашутыст» М. Лынькова.

4. *Супадзенне фабулы і сюжэта*. Яно тлумачыцца псіхалогіяй маленькага чытача. Дзецям лягчэй успрымаць мастацкую гісторыю, падзеі якой разгортваюцца паслядоўна, паступова, без кампазіцыйных ускладненняў. Адзінства фабулы і сюжэта назіраем у апавяданні «У старых дубах» Я. Коласа.

Такім чынам, выкладзеныя назіранні і вывады прывялі да наступных высноў. Па-першае, карані беларускага дзіцячага мастацкага апавядання знаходзяцца ў вуснай народна-паэтычнай творчасці народа. Па-другое, апавяданню як жанру беларускай дзіцячай мастацкай літаратуры ўласцівы не толькі агульныя прыметы з т. зв. «дарослай» «малой эпічнай формай», а і свае – спецыфічныя, абумоўленыя ўзроставымі і індывідуальнымі адметнасцямі дзіцяці як адрасата мастацкага твора.

### Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Адамовіч, А. Беларускае апавяданне / А. Адамовіч // Анталогія беларускага апавядання : у 2 т. – Мінск : Беларусь, 1967. – Т. 1. – 1967. – С. 5–6.

2. Андраюк, С. А. Апавяданне / С. А. Андраюк // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1984. – Т. 1 : Акапэла – Габелен. – 1984. – С. 137–139.

3. Лазарук, М. А. Апавяданне / М. А. Лазарук // Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – 3-е выд. – Мінск : Народная асвета, 2003. – С. 24–25.

4. Макарэвіч, А. М. Апавяданне / А. М. Макарэвіч // Беларуская дзіцячая літаратура ў тэрмінах і паняццях : дапаможнік / А. М. Макарэвіч, В. І. Караткевіч ; пад агул. рэд. А. М. Макарэвіча. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2014. – С. 14–15.

5. Макарэвіч, А. М. Дзіцячая літаратура / А. М. Макарэвіч // Беларуская дзіцячая літаратура ў тэрмінах і паняццях : дапаможнік / А. М. Макарэвіч, В. І. Караткевіч ; пад агул. рэд. А. М. Макарэвіча. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2014. – С. 49–53.

6. Рагойша, В. П. Апавяданне / В. П. Рагойша // Літаратуразнаўчы слоўнік : тэрміны і паняцці : для школьнікаў і абітурыентаў. – Мінск : Народная асвета, 2009. – С. 21–23.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова